# «Акваканцэпт»: канцэнтрацыя беларускай акварэлі

Школа-клуб мастака Уладзіміра Рынкевіча разам з Арт-студыяй «Аквавір» пры падтрымцы Беларускага саюза мастакоў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прадставілі 14 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі выстаўку акварэлі «Акваканцэпт». Свае аўтарскія канцэпцыі і асобныя працы паказалі У. Рынкевіч, Вячаслаў Паўлавец, Зоя Луцэвіч, Алесь Квяткоўскі, Рыгор Мяжуеў, Сяргей Пісарэнка, Мікола Аўчыннікаў, Святлана Каткова, Святлана Курашова ды іншыя. У экспазіцыі можна было ўбачыць разнастайнасць мастацкіх вобразаў і тэхнік.

Мерапрыемства распачалі ўдзельнікі тэатра танца «Отражение» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі пад кіраўніцтвам Антаніны Рудкоўскай, якія прадэманстравалі сваё харэаграфічнае майстэрства.

Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алена Даўгаполава распавяла, што ў фондах бібліятэкі налічваецца каля 1 300 акварэльных выяваў. Чарговая выстаўка акварэлі стала ўжо сямнаццатай з ліку тых, што ладзяцца ў новым будынку бібліятэкі.



Намесніка старшыні Беларускага саюза мастакоў па выставачнай дзейнасці Леаніда Хобатава цешыць, што сярод удзельнікаў выстаўкі разам са сталымі мастакамі ёсць моладзь, таленавітыя пачаткоўцы. У Беларусі востра стаіць пытанне з арганізацыяй выставак таму, што не хапае пляцовак, а каб задаволіць попыт, патрэбная, паводле меркавання Л. Хобатава, плошча не менш за 10 000 м$^2$.

Мастацтвазнаўца Галіна Флікоп-Світа назвала акварэль адным з самых складаных накірункаў жывапісу. Аднак мастакі выдатна валодаюць матэрыялам, адчуваюць яго спецыфіку. Г. Флікоп-Світа адзначыла і выключную ролю куратара выстаўкі У. Рынкевіча, які гуртуе вакол сябе беларускіх акварэлістаў і ўсебакова спрыяе развіццю акварэльнага мастацтва.

Прадстаўнік Віцебскай школы акварэлі, сябра Беларускага саюза мастакоў У. Рынкевіч паведаміў, што выстаўка «Акваканцэпт» – адзін з крокаў вялікай праграмы праекта «Беларуская акварэль». Першы крок – выданне ўжо падрыхтаванай да друку манаграфіі-альбома «Беларуская акварэлія», праца над якой ішла больш за 10 гадоў (варта згадаць, што апошні альбом беларускай акварэлі быў выдадзены ў канцы 1970-х гадоў). Другі крок – стварэнне першай ў Беларусі акварэльнай галерэі. Месцам для яе абраны стары трохпавярховы будынак на беразе возера ў г.п. Расоны, і ў красавіку галерэя адчыніць свае дзверы. Трэці крок – правядзенне маштабных выставак рознага кірунку, дзе кожны акварэліст знойдзе сваё месца. Асобная роля адведзеная арганізацыі сумесных пленэраў моладзі са сталымі майстрамі акварэлі. Значнай падзеяй таксама з'яўляецца выданне грунтоўнай працы «Асобы і вобразы», прысвечанай мастакам XIX стагоддзя. Неўзабаве чакаецца выданне па беларускай графіцы XIX стагоддзя.

Чым жа тлумачыцца такая моцная цікавасць да акварэлі? Магчыма, адказам стане меркаванне крытыка Мікалая Паграноўскага, які лічыць, што мастацтва мусіць будзіць думкі гледача, а задача мастакоў у наш нестабільны час – ураўнаважыць свет сваёй творчасцю.

*Наталі КУПРЭВІЧ*
*Фота аўтара*